# «ВЕДАЙ РОДНУЮ МОВУ»

21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы. Гэтае свята адзначаюць найперш філолагі і ўсе тыя, хто неабыякава ставіцца да роднай мовы, літаратуры, культуры і гісторыі сваёй Радзімы. У гэты дзень звычайна праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы, прысвечаныя святочнай даце. Не застаўся ў баку і наш універсітэт. Студэнты 5 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці «Беларуская філалогія» пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры літаратуры Ірыны Вацлаваўны Саматой правялі інтэлектуальную гульню «Ведай родную мову» для першакурснікаў.

Студэнты 1 курса падзяліліся на дзве каманды і актыўна ўдзельнічалі ў гульні, якая складалася з чатырох этапаў. Спачатку хлопцы і дзяўчаты адказвалі на пытанні, звязаныя з гісторыяй мовы, затым па радках вершаў адгадвалі іх аўтараў – айчынных паэтаў, слухалі папулярныя беларускія песні, разглядалі фотаздымкі Рыгора Барадуліна, Максіма Танка, Максіма Багдановіча і іншых майстроў беларускага слова. Мерапрыемства паказала, што студэнты-першакурснікі добра валодаюць беларускай мовай, цікавяцца нацыянальнай гісторыяй і літаратурай.

Прысутнічалі на інтэлектуальнай гульні і студэнты спецыяльнасці «Руская філалогія», якія актыўна заўзелі за сваіх сяброў. Напрыканцы мерапрыемства ўдзельнікі атрымалі ўзнагароды і віншаванні ад студэнтаў старэйшых курсаў.

**Таццяна ПЯТКЕВІЧ, студэнтка 5 курса ФлФ.**